УДК 394.014

# АНТРАПАЛОГІЯ РЭВАЛЮЦЫІ: ПАЎСЯДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ МІНЧАН У 1917 г.

*А. А. ГУЖАЛОЎСКІ*[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца асаблівасці паўсядзённых практык насельніцтва Мінска паміж Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі 1917 г. Аналізуюцца паводзіны гарадскіх жыхароў ва ўмовах змены ўлады, ваенных дзеянняў, гаспадарчай разрухі. Характарызуюцца спробы самастойнага вырашэння праблем насельніцтвам.

***Ключавыя словы:*** Лютаўская рэвалюцыя; Першая сусветная вайна; насельніцтва горада; паўсядзённасць; забеспячэнне; злачыннасць; беспрацоўе; адпачынак; бежанцы.

# АНТРОПОЛОГИЯ РЕВОЛЮЦИИ: ПОВСЕДНЕВНАЯ ЖИЗНЬ МИНЧАН В 1917 г.

*А. А. ГУЖАЛОВСКИЙ*[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются особенности повседневных практик населения Минска между Февральской и Октябрьской революциями 1917 г. Анализируется поведение городских жителей в условиях смены власти, военных действий, хозяйственной разрухи. Характеризуются попытки самостоятельного решения бытовых проблем населением.

***Ключевые слова:*** Февральская революция; Первая мировая война; население города; повседневность; снабжение; преступность; безработица; досуг; беженцы.

# ANTHROPOLOGY OF REVOLUTION: DAILY LIFE OF MINSK RESIDENTS IN 1917

*A. A. HUZHALOUSKI*[a]

[a]*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus*

The article discusses the peculiarities of everyday practices of the population of Minsk between the February and October revolutions of 1917. The behavior of urban residents under conditions of a change of power, military action, economic disruption is analyzed. Attempts to solve domestic problems independently are characterized.

***Key words:*** February Revolution; First World War; city population; everyday life; crime; unemployment; leisure time; refugees.

**Образец цитирования:**
Гужалоўскі А. А. Антрапалогія рэвалюцыі: паўсядзённае жыццё мінчан у 1917 г. // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 3. С. 20–29.

**For citation:**
Huzhalouski A. A. Anthropology of revolution: daily life of Minsk residents in 1917. *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2017. No. 3. P. 20–29 (in Belarus.).

**Автор:**
***Александр Александрович Гужаловский*** – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета.

**Author:**
***Alexander A. Huzhalouski***, doctor of science (history), full professor; professor at the department of ethnology, museology and art history, faculty of history.
*huzhalouski@gmail.com*

## Уводзіны

Нягледзячы на вялікую колькасць літаратуры, прысвечанай падзеям 1917 г. у Мінску, тагачаснае паўсядзённае жыццё людзей застаецца малавывучаным [1–3]. Народныя масы ў большасці прац выступаюць у якасці фону для аповеду пра важныя гістарычныя падзеі. Нявывучанымі застаюцца рэальныя жыццёвыя праблемы і інтарэсы «маленькага» чалавека, яго каштоўнасныя арыентацыі ў пераломны момант гісторыі. Між тым пранікненне ў псіхалогію людзей, якія перажывалі рэвалюцыйныя трансфармацыі, рэканструкцыя іх бытавых практык і паводзін дазволіць не толькі зазірнуць на ніжнія паверхі гістарычнага працэсу, якім традыцыйна не надаецца належнай увагі, але і лепш зразумець логіку развіцця палітычных падзей 1917 г.

## Асноўная частка

На пачатку XX ст. Мінск паступова ператвараўся ў эканамічны, палітычны і культурны цэнтр беларускіх этнічных земляў. Адпаведна адбываліся змены ў паўсядзённым жыцці насельніцтва горада, якое рабілася больш сацыяльна і этнічна разнастайным, дынамічным, ліберальным. Побыт гараджан змяняўся пад уздзеяннем развіцця прамысловай вытворчасці, транспарту, новых тэхналогій у камунальнай гаспадарцы. Змены ў традыцыйных паўсядзённых практыках мінчан адбываліся не толькі ў выніку мадэрнізацыйных працэсаў, але і пад уплывам Першай сусветнай вайны. У Мінску знаходзіўся штаб Заходняга фронту, прадстаўніцтвы розных арганізацый па яго матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні, ваенная камендатура, гарнізон. Кожны дзень праз Віленскі і Аляксандраўскі вакзалы па чыгунцы ў бок фронту везлі ваеннаслужачых, тэхніку, харчовыя тавары, у адваротны бок ішлі санітарныя саставы з параненымі і хворымі. Горад апынуўся ў цэнтры вызначанай камандуючым Заходнім фронтам рысы Полацк – Мінск – Мазыр, на захад ад якой пачыналася прыфрантавая зона. Знаходзіцца ў яе межах без адпаведнага дазволу цывільным асобам было забаронена.

Падчас вайны змяняліся дэмаграфічныя паказчыкі, умовы сацыяльнага і бытавога існавання, а разам з імі – асноўныя характарыстыкі гарадской паўсядзённасці. Калі да пачатку вайны ў Мінску пражывалі 110 тыс. чалавек, то ў 1917 г. гэта лічба павялічылася амаль у два разы і дасягнула 200 тыс. чалавек, а разам з прыгарадамі – 250 тыс. чалавек. Усе яны размясціліся ў 7,1 тыс. будынкаў на плошчы 20 кв. вёрст[1]. Усеагульная мабілізацыя прывяла да замены больш як паловы карэннага мужчынскага насельніцтва Мінска ваеннымі, рабочымі і служачымі тылавых арганізацый, а таксама ваеннапалоннымі. У горадзе і наваколлі з’явілася шмат бежанцаў, якія колькасна павялічылі этнічныя групы палякаў і рускіх, а таксама стварылі новыя супольнасці – групы латышоў і літоўцаў. Паводле перапісу насельніцтва, які праводзіўся мінскай гарадской управай у верасні 1917 г., суадносіны асноўных этнічных груп, што пражывалі ў той час у горадзе, выглядалі наступным чынам: 44 % яўрэяў, 26,5 % рускіх, 23,4 % палякаў, 2,4 % беларусаў [1, с. 21].

Сярод прадстаўнікоў новых этнічных супольнасцей, якія з’явіліся ў Мінску, былі кітайцы, якія працавалі пераважна на тылавых будаўнічых, дарожных, пагрузачна-разгрузачных працах. Некаторыя з іх, напрыклад шпага- і змееглытальнікі, уносілі ў гарадское вулічнае жыццё новыя экзатычныя фарбы[2]. На цяжкіх фізічных працах былі таксама заняты прадстаўнікі іншых, невядомых для большасці гараджан, нацыянальных груп – сарты (узбекі і таджыкі) і кіргізы (уласна кіргізы і казахі). Яны не размаўлялі па-руску, не ўступалі ў кантакт з мясцовым насельніцтвам і жылі ў палатках у наваколлі горада.

Калі 27 лютага 1917 г. у Петрагарадзе пачалося ўзброенае паўстанне, жыццё мінчан ішло сваім звычайным мерным ходам. Раніцай мінскі губернатар У. А. Друцкі-Сакалінскі прыняў гарадскога галаву С. Б. Хржанстоўскага. Падчас іх размовы абмяркоўвалася апошняя пастанова Мінскай гарадской думы аб забароне вытворчасці ва ўмовах дэфіцыту ў горадзе цукру, салодкіх мучных вырабаў. Мінскі паліцмайстар А. А. Лебяда ў той дзень, напярэдадні крыгаходу, выправіўся аглядаць берагі Свіслачы, а таксама небяспечныя ледзяшы, што ўтварыліся на дахах дамоў. Удзень сваякі і былыя пацыенты пахавалі ардынатара Мінскага яўрэйскага шпіталя Г. Я. Ліўшыц, якая дзякуючы сваёй дабрыні і прафесіяналізму карысталася вялікай папулярнасцю ў бедных мінчан. Бліжэй да вечара прыхільнікі творчасці І. Мазжухіна запоўнілі кінатэатр «Эдэн», дзе дэманстравалася псіхалагічная драма «На вяршыні славы». Аматары тэатральнага мастацтва накіраваліся на прэм’еру п’есы «Злачынства на заезным двары» ў выкананні трупы Кіеўскага гарадскога тэатра[3].

Але ўжо на пачатку сакавіка выгляд вуліц горада змяніўся. З былой Саборнай плошчы, перайменаванай у плошчу Свабоды, знік помнік імператару Аляксандру ІІ. У скверы, на трэку, каля Залатагор-

[1]Минский голос. 1917. 26 апр. (№ 2412). С. 3.
[2]*Консторум И.* Китайцы // Варшав. утро. 1917. 2 июля (№ 397). С. 3.
[3]Минский голос. 1917. 27 февр. (№ 2362). С. 1–4.

скага касцёла штодня праходзілі мітынгі. У гарадской прасторы дамінаваў чырвоны колер шматлікіх рэвалюцыйных сцягоў, транспарантаў, а таксама бантаў, якія прымацоўвала да грудзей дэмакратычная грамадскасць. У красавіку газета «Минский голос» паведамляла: «Апошнім часам у Мінск прыбылі з ссылкі і турмаў шмат вызваленых палітычных, якія вяртаюцца, як кажуць, у чым бог паслаў»[1](тут і далей пераклад наш. – *А. Г.*). Непрыемнымі прыкметамі надыходу рэвалюцыйнага часу было павелічэнне крымінальнай вулічнай актыўнасці і засмечанасць грамадскіх месцаў.

У 1917 г. у Мінску яшчэ больш, чым у папярэднія ваенныя гады, узрос дэфіцыт жылля. Гэта было абумоўлена дадатковай нагрузкай на інфраструктуру горада ў выніку рэвалюцыйных падзей. Да старых праблем, такіх як размяшчэнне тылавых арганізацый і параненых (у Мінску пражывалі 6 тыс. воінаў-калек), дадаліся новыя: наплыў з Гродзенскай і Віленскай губерняў бежанцаў, якія спрабавалі вярнуцца дамоў у спадзяванні на хуткае рэвалюцыйнае замірэнне. Пасля захопу немцамі Рыгі ў Мінск прыбыла новая хваля бежанцаў, на гэты раз з захаду. У выніку павелічэння колькасці насельніцтва пакой сярэдніх памераў у кватэры альбо доме летам каштаваў прыкладна 150 руб. у месяц. Рост цэн на жыллё прыпыніла пастанова Часовага ўрада, якая з 5 жніўня 1917 г. абмяжоўвала кватэрную плату памерамі, якія існавалі да 19 ліпеня 1914 г., а таксама забараняла домаўласніку ў аднабаковым парадку высяляць наймальніка жылля[2].

У ліпені Мінская гарадская дума павялічыла падатак на нерухомасць у залежнасці ад яе прыбытковасці на 32–65 %, а таксама падатак для ўладальнікаў аўта-, мота- і велатэхнікі, коней і сабак. Так, за ўтрыманне сабакі яе ўладальнік быў абавязаны плаціць гораду 10 руб. у год. Павялічыліся таксама кошты на камунальныя паслугі. Напрыклад, новы тарыф на электрычнасць для фізічных асоб павысіўся да 70 капеек за кілават, для камерцыйных установаў – да рубля. Месячная абаненцкая плата за тэлефон узнялася амаль напалову і склала 8 руб. У кастрычніку павысіліся тарыфы на праезд у грамадскім транспарце (конным трамваі)[3].

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі паскорыўся працэс інфляцыі: абясцэньваўся расійскі папяровы рубель, што ў спалучэнні з павышэннем цэн прыводзіла да падзення жыццёвага ўзроўню насельніцтва. У 1917 г. старшыня Мінскай гарадской думы атрымліваў 450 руб. у месяц, будаўнічы рабочы – 200, журналіст – 150, міліцыянер – 140, настаўнік – 100, сястра міласэрнасці – 70, тэлефаністка – 40, прачка – 30 руб. Што ў рэальнасці стаяла за гэтымі лічбамі, дазваляюць уявіць наступныя радкі з дзённіка мінскага рабочага-чыгуначніка І. П. Голубева, чыя прафесія з'яўлялася адной з найбольш высокааплачваных: «1 кастрычніка 1917. Нядзеля. Зайшоў у ашчадную касу, унёс грошай 300 руб. на сваю кніжку. Заробак атрымаў за жнівень у памеры 427 руб. 30 кап. Заробак даволі вялікі, але страшэнная дарагоўля ўсё жарэ. Цяпер фунт сала каштуе 3 руб. 50 кап., фунт масла – 4 руб. 50 кап., фунт жытняга хлеба – 20 кап., боты – 150 руб. Пра адзенне страшна і казаць. Рабочы гарнітур – 100 руб. і г. д. За тры гады я сабе ніякага адзення не набыў, усё старое даношваю, перашываю. І таму ў мяне невялікая эканомія атрымліваецца»[4].

На пачатку жніўня ў Мінскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў знаходзілася на ўліку звыш тысячы беспрацоўных. Акрамя іх, у горадзе была вялікая колькасць незарэгістраваных асоб, якія шукалі працу. Іх стала яшчэ больш пасля закрыцця ў сярэдзіне жніўня папіроснай і канвертнай фабрык, дзе працавалі больш за 500 рабочых. Мінская гарадская дума выдзеліла для дапамогі беспрацоўным суму ў памеры 30 тыс. руб.[5]

У гэтых умовах без працы засталіся перш за ўсё прадстаўнікі інтэлігентных прафесій – інжынеры, настаўнікі, бухгалтары, – якія не маглі знайсці ніякай працы. Крыху прасцей было працаўладкавацца цеслярам, кавалям, швачкам, але і ім прапаноўваліся пераважна вакансіі з мізэрнай аплатай. Будаўнік І. З. Грабенчык так ахарактарызаваў сітуацыю на гарадскім рынку працы для прадстаўнікоў яго прафесіі: «Пасля Лютаўскай рэвалюцыі беспрацоўе было неверагоднае, ніхто нічога не будаваў. Будаўнікі натуральна галадалі, займаліся чым заўгодна, напрыклад, ехалі на вёску класці печ за пуд мукі»[6].

На фоне галечы асноўнай масы гараджан выдзяляўся шыкоўны лад жыцця штабістаў, «земгусараў», а таксама розных дзялкоў і спекулянтаў, якія нажывалі на аперацыях па пастаўках у дзеючую армію вялікія грошы. Кожны вечар у лепшай у горадзе кавярні «Селект» пакідалі значныя сумы дарага апранутыя мужчыны і жанчыны. Мінскія гандляры дэманстравалі высокую ступень прыстасавальнасці да любога палітычнага рэжыму і здольнасць абыходзіць усе забароны. Зрэшты, у гандлі, які рабіўся сродкам выжывання, спрабавалі сябе прадстаўнікі розных сацыяльных груп, нават салдаты, якія адкрыта прадавалі казённую маёмасць на рынках горада.

[1]Минский голос. 1917. 26 апр. (№ 2412). С. 3.
[2]Журнал заседаний Временного правительства, март–октябрь 1917 г. М., 2001. Т. 3. С. 240–249.
[3]Нац. гіст. архіў Беларусі. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 3659. Арк. 72, 73.
[4]«Счастье мое…» Дневники Иосифа Голубева. 1916–1923. Минск, 2002. С. 86.
[5]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 3660. Арк. 66.
[6]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 60п. Воп. 4. Спр. 128. Арк. 2.

На працягу вайны сельскагаспадарчая вытворчасць скарачалася, абмен паміж вёскай і горадам парушаўся, узрастала грашова-папяровая эмісія, што прыводзіла да зніжэння курса рубля. Неўзабаве пасля пачатку вайны з мэтай барацьбы супраць павышэння цэн на прадукты харчавання мінскія ўлады – губернатар, гарадская дума, ваенна-харчовая камісія – пачалі ўводзіць таксы – верхні цэнавы максімум. Таксаваліся аптовыя і рознічныя цэны на базавыя прадукты харчавання, такія як хлеб, мяса, цукар, рыба, алей, што ва ўмовах адсутнасці адзінай дзяржаўнай сістэмы рэгуліроўкі цэн часта прыводзіла да іх знікнення з Мінска і з'яўлення ў іншых месцах па больш высокіх, рыначных коштах. З 1915 г. Мінская гарадская дума ўвяла абмежаванні ў спажыванні мясапрадуктаў, тады ж з'явілася нармаваная (па бонах) выдача жыхарам мукі, мяса, рыбы, круп, солі[1].

Адным з першых крокаў Часовага ўрада, накіраваных на стабілізацыю харчовага рынку, было ўвядзенне хлебнай манаполіі: 25 сакавіка 1917 г. з'явіўся закон «Аб перадачы хлеба ў распараджэнне дзяржавы», згодна з якім вытворца павінен быў прадаваць дзяржаве па цвёрдых коштах усе лішкі збожжа[2]. Гэты захад не даў чаканых вынікаў і прывёў да масавай спекуляцыі, пашырэння чорнага рынку і яшчэ большага павелічэння цэн. Бескантрольная папярова-грашовая эмісія разбурала таварна-грашовую сістэму, што прыводзіла да пашырэння карткавай сістэмы размеркавання. На працягу 1917 г. у Мінску з'явіліся боны на цукар, яйкі, масла, гарбату, газу, дровы, а таксама некаторыя іншыя спажывецкія тавары. Бонавыя кніжкі гараджане атрымлівалі ў харчовым камітэце пры наяўнасці пашпарта і выпіскі з дамовай кнігі[3].

Атаварваліся боны ў крамах, да якіх гараджане прымацоўваліся па месцы жыхарства. Напрыклад, у сярэдзіне чэрвеня мучнымі вырабамі жыхароў горада забяспечвала 101 хлебная крама з разліку 2 фунты (819 г) на чалавека на тыдзень па цане 23 кап. за бохан. Рабочыя, занятыя на фізічных работах, атрымлівалі паўтарачную норму. Ва ўмовах збояў у пастаўках мяса з паўднёвых губерняў мінскія мяснікі, нягледзячы на ўведзеныя таксы, узнялі цану на тавар да 2 руб. 30 кап. за фунт. У той жа час «беларускі хлеб» – бульбу, якая знаходзілася ў вольным продажы, – можна было набыць па цане 1 руб. 60 кап. за пуд (10 кап. за кілаграм)[4].

Увосень 1917 г., нягледзячы на намаганні губернскай харчовай управы, забеспячэнне Мінска прадуктамі, перш за ўсё хлебам, пагаршалася. У раздзеле афіцыйнай хронікі мінскай газеты «Варшавское утро» за 29 верасня чытаем: «Учора [Мінская] гарадская дума да позняй ночы абмяркоўвала перспектывы хлебнага голаду»[5]. Беларуская пісьменніца і грамадскі дзеяч Л. А. Сівіцкая-Войцік наступным чынам перадавала сітуацыю, што склалася ў горадзе ўвосень 1917 г.: «Цяжка тады жылося… Крамы пустыя, хлеб добра калі ўдалося купіць у салдатаў, на рынку пуста… прабавалі г. зв. "муку" з сухіх абаранкаў. Толькі бульбы то яшчэ купіць можна было. Былі дні, калі на снеданне замест хлеба ды гарбаты мама смажыла бульбяныя блінкі»[6]. Вялікай радасцю для дачкі і маці быў прыезд з фальварка Мігаўка А. Уласава, які прывёз адтуль «аграмадны бохан хлеба». Паралельна з нармiраванай сістэмай размеркавання прадуктаў існаваў вольны рынак, дзе можна было набыць літаральна ўсё – ад антыкварных прадметаў да аўта- і мотатэхнікі. Цэны на асноўныя прадукты харчавання з лютага па кастрычнік выраслі на ім у 5–8 разоў.

Найбольш запатрабаваным на рынку таварам быў алкаголь, продаж якога забаранілі яшчэ ў 1914 г. Збытам алкагольных вырабаў у Мінску займаліся рэстараны, кавярні, чайныя, якія перыядычна штрафаваліся і нават зачыняліся за незаконны гандаль. Тым не менш звышдаходы, якія атрымлівалі ўдзельнікі нелегальнага алкагольнага гандлю, пераважаў страх пакарання. Напрыклад, пры двухрублёвым сабекошце вырабу бутэлькі самагону яна прадавалася ў залежнасці ад гатунку ад 5 руб. («ханжа») да 28 руб. («крышталізацыя»). Бутэлька спірту каштавала на чорным рынку 50 руб.[7]

Ва ўмовах харчовых цяжкасцей Мінская гарадская дума стварыла арцель сельскагаспадарчых рабочых, якая складалася з бежанцаў і ваеннапалонных. Іх намаганнямі ўвосень 1917 г. горад атрымаў неблагі ўраджай бульбы, капусты і морквы ва ўрочышчы Людамонт[8]. Адначасова жыхары горада паводле ўласнай ініцыятывы арганізоўвалі пункты гармадскага харчавання. З сярэдзіны красавіка ад 14-й да 16-й гадзіны абеды па прымальных коштах прапаноўвала «беларуская сталовая»[9]. Уласныя сталовыя мелі земскія ўстановы і прафсаюзныя арганізацыі. У першым нумары друкаванага органа Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў паведамлялася, што «…у сувязі харчовым крызісам

[1]Новая серия продуктовъ по бонамъ // Минский голос. 1917. 25 янв. (№ 2329). С. 3.
[2]Законы и постановления. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Петроград, 1917. Вып. 1. С. 69–109.
[3]Минский голос. 1917. 2 июня (№ 2442). С. 4.
[4]Варшав. утро. 1917. 2 июня (№ 2442). С. 3.
[5]Варшав. утро. 1917. 2 июня (№ 2442). С. 3.
[6]*Верас З.* Выбраныя творы. Мінск, 2015. С. 138.
[7]«Ханжа» и «самогонка» // Варшав. утро. 1917. 30 авг. (№ 442). С. 3.
[8]Варшав. утро. 1917. 19 сент. (№ 458). С. 3.
[9]Минский голос. 1917. 14 апр. (№ 2403). С. 1.

у хуткім часе адкрываецца сталовая-буфет для членаў Выканаўчага камітэта і Савета. Абеды і вячэры будуць адпускаць па сабекошце»[1].

Санітарнае становішча ў Мінску рэзка пагоршылася пасля з'яўлення ў горадзе вайсковых кантынгентаў, а таксама плыней бежанцаў. У 1915 г. у дапамогу камітэту Мінскай гарадской думы, які адказваў за санітарна-эпідэміялагічнае становішча, камітэт Заходняга фронту Усерасійскага саюза гарадоў стварыў ваенна-санітарную камісію. Сітуацыю ўскладнялі прыродныя катаклізмы, у прыватнасці паводка, якая адбылася ў Мінску ў канцы сакавіка 1917 г. Тады ўзровень вады ў Свіслачы ўзняўся на паўтара сажня, у выніку чаго былі затоплены першыя паверхі многіх дамоў, загінулі людзі. На непрацяглы час спыніла працу гарадская электрастанцыя, а разам з ёй і водаправод[2].

Думскі камітэт па наглядзе за санітарным становішчам 31 сакавіка 1917 г. распрацаваў, а камісія ўхваліла пастанову, у адпаведнасці з якой домаўласнікі кожнай мінскай вуліцы абавязваліся абраць са свайго складу асобу, адказную за ўтрыманне ў чысціні не толькі вуліцы, але і прылеглых да яе двароў. Гэтыя асобы надзяляліся правам рабіць неахайным гаспадарам заўвагі, а ў выпадку іх ігнаравання – паведамляць участковаму камісару міліцыі. Апошні складаў пратакол, які перадаваўся міравому суддзю. Той прымаў рашэнне аб навядзенні парадку, звычайна за кошт вінаватага домаўласніка[3].

Востра стаяла праблема асенізацыі. Праз адсутнасць агульнагарадской каналізацыйнай сеткі выграбныя ямы і бруд на вуліцах павялічвалі верагоднасць узнікнення эпідэмій, павышалі колькасць захворванняў і ўзровень смяротнасці. На пачатку красавіка ваенна-санітарная камісія была вымушана звярнуцца да ваеннага камандавання Заходняга фронту з просьбай аб тэрміновым выдзяленні 30 тыс. руб. для ачысткі горада ад прадуктаў жыццядзейнасці яго насельнікаў у аб'ёме 58 тыс. вазоў[4].

Пітная вада за межамі вадаправода, якім карысталіся жыхары цэнтральнай часткі горада, была забруджана. Гэта стварала рэальную магчымасць узнікнення страўнікава-кішэчных эпідэмічных захворванняў. У чэрвені з мэтай папярэджання эпідэмій на гарадскіх рынках з'явіліся ёмістасці з кіпячонай вадой, а таксама плакаты санітарна-асветніцкага зместу. Міліцыянеры перыядычна забіралі ваду з калодзежаў для правядзення мікрабіялагічных аналізаў[5]. Дадатковыя цяжкасці ў справе забеспячэння санітарна-гігіенічных норм гарадскога жыцця дадавала дзейнасць левых партый і прафсаюзаў. Напрыклад, у адказ на іх заклікі 20 ліпеня неабмежаваную па часе забастоўку абвясцілі работнікі ўсіх мінскіх лазняў[6].

Праз перавышэнне норм шчыльнасці засеPленасці ў Мінску павялічылася колькасць хворых на сыпны тыф. Для барацьбы з гэтай небяспечнай хваробай, якая да восені ў некаторых мясцовасцях Мінскай губерні набыла характар эпідэміі, Міністэрства ўнутраных спраў выдзеліла губернскаму камісару Б. М. Самойленку крэдыт у памеры 10 тыс. руб. Гарадская дума вырашыла адкрыць побач з Аляксандраўскім мостам бясплатную амбулаторыю для беднай часткі насельніцтва[7].

Аднак колькасць хворых не змяншалася. Шмат заражаных было выяўлена ў рабочых дружынах Камітэта ўсерасійскіх земскага і гарадскога саюзаў па забеспячэнні арміі пад Мінскам. Сучаснік пакінуў наступнае апісанне санітарна-бытавых умоў, у якіх жылі рабочыя: «У зямлянцы даўжынёй 20 і шырынёй 8 аршынаў жыве больш за 100 чалавек. Святло і паветра ў ёй адсутнічае, на падлозе – бруд. Пасярэдзіне зямлянкі збудаваны двух'ярусныя брудныя нары, на якіх покатам спяць рабочыя разам з усёй сваёй маёмасцю. Значная іх колькасць наладзіла гнёзды пад нарамі, на голай зямлі. Палаткі кіргізаў маюць яшчэ больш сумны выгляд – без пячэй, падлогі і нар. Каб сагрэцца, кіргізы распальваюць вогнішчы ўнутры палатак. Вошай – хоць рыдлёўкай грабі. Няма пральні, сушылак, рукамыйніц. Мужчыны і жанчыны жывуць разам»[8].

Павялічылася таксама колькасць венерычных захворванняў. Пра вастрыню пытання барацьбы з імі сведчыла наступная аб'ява, якая з'явілся ў газеце «Минский голос» у канцы красавіка 1917 г.: «Школьны фельчар прымае па венерычных захворваннях і пранцах з паловы трэцяй да паловы сёмай па адрасе Захар'еўская 101–4»[9]. Ва ўмовах дэфіцыту кваліфікаванай медыцынскай дапамогі праблема венерычных захворванняў, якія набывалі эпідэмічны характар, асабліва сярод ваеннаслужачых, стала тэмай спецыяльнага пасяджэння ваенна-санітарнай камісіі ў сярэдзіне ліпеня. Было вырашана ўзмацніць нагляд за прастытуткамі, а таксама

[1]Бюл. Минского совета рабочих и солдат. депутатов. 1917. 27 окт. № 1. С. 2.
[2]Минский голос. 1917. 28 марта (№ 2389). С. 3.
[3]Минский голос. 1917. 31 марта (№ 2392). С. 3.
[4]Минский голос. 1917. 6 апр. (№ 2396). С. 3.
[5]Варшав. утро. 1917. 14 июня (№ 357). С. 3.
[6]Варшав. утро. 1917. 14 июня (№ 357). С. 3.
[7]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 3660. Арк. 66.
[8]Изв. Совета рабочих и солдатских депутатов, Минск. 1917. 27 авг. (№ 58). С. 4.
[9]Минский голос. 1917. 26 апр. (№ 2412). С. 4.

адкрыць некалькі новых бясплатных амбулаторый для «венерыкаў»[1]. Першая з іх распачала прыём хворых (мужчын і жанчын) ужо на пачатку жніўня[2].

Сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў горадзе, якая на працягу 1917 г. пагаршалася, паўплывала на рэзкае павелічэнне смяротнасці ў выніку атручвання алкагольнымі сурагатамі. Пра падобныя выпадкі ў раздзеле «Хроніка» рэгулярна паведамлялі гарадскія газеты, напрыклад: «Уначы на Кальварыйскай вуліцы знойдзена цела нежывой жанчыны. Атручванне дэнатуратам»[3]. Рэвалюцыйныя змены дадалі ў псіхіятрычнае аддзяленне губернскага земскага шпіталя новых пацыентаў, колькасць якіх да сярэдзіны лета дасягнула 150 чалавек[4].

У 1917 г. мінчане маглі штодня выправіцца з Аляксандраўскага вакзала на хуткім цягніку мясцовага фарміравання ў Маскву, а таксама на двух пасажырскіх – у Пагарэльцы і Лунінец. На Віленскім вакзале прадаваліся квіткі на пасажырскія цягнікі мясцовага фармавання «Мінск – Бахмач» і «Мінск – Маладзечна». Акрамя таго, праз мінскія вакзалы ішлі прахадныя пасажырскія цягнікі (напрыклад, «Петраград – Кіеў»), а таксама вайсковыя і санітарныя эшалоны[5]. На працягу 1917 г. на чыгунцы павялічваліся крызісныя з'явы: скарачалася колькасць вагонаў і паравозаў, рухомы склад амаль не абнаўляўся, пагаршаўся стан пуцей. Вагоны ўсіх класаў, у тым ліку спальныя, былі перапоўнены ваеннаслужачымі, мяшэчнікамі, «зайцамі» з рознымі фіктыўнымі пасведчаннямі. Летам зніклі хуткія цягнікі, а чыгуначнікі ў сувязі з пагаршэнем крымінальнай сітуацыі атрымалі дазвол на нашэнне зброі. Стан анархіі, у які паступова пераходзіла чыгунка, непазбежна вёў да катастроф, адна з якіх адбылася 27 ліпеня паміж станцыямі Жодзіна і Вітгенштэйнская. У той дзень пасажырскі цягнік сутыкнуўся з некалькімі вагонамі, якія адчапіліся ад санітарнага эшалона, у выніку чаго 9 чалавек загінулі, а 40 былі паранены[6].

Дадатковую блытаніну ў работу мінскага транспарту, як чыгуначнага, так і гарадскога, унёс дэкрэт Часовага ўрада аб пераходзе краіны на летні час з 1 ліпеня 1917 г., калі стрэлкі гадзіннікаў трэба было перавесці на гадзіну наперад. У той дзень многім гараджанам, якія спазняліся, давялося замест коннага трамвая (конкі), дзе кошт праезду па-ранейшаму складаў 15 кап., скарыстацца паслугамі рамізнікаў, якія бралі за праезд ад плошчы Свабоды да Аляксандраўскага вакзала 2 руб. (ламавыя рамізнікі бралі за дастаўку грузаў на гэту адлегласць 12 кап.)[7].


КОМЕНДАНТЪ
ГОРОДА
МИНСКА.
8 Июля 1917 г.
№2497

УДОСТОВѢРЕНІЕ.

Предъявител[ю] сего, ...

разрѣшается ... проѣздъ до ст. ...

что подписью, съ приложеніемъ казенной печати, удостовѣряется.

Настоящее удостовѣреніе дѣйствительно отъ вышеписаннаго числа въ теченіе ...

По истеченіи срока удостовѣреніе подлежитъ отобранію гражданскими или военными властями и отправленію въ Минское Комендантское Управленіе или возвращенію туда-же, взявшимъ удостовѣреніе, лицомъ.

Видомъ на жительство служить не можетъ.

Полковникъ

Комендантскій Адъютантъ
Штабсъ-Капитанъ

Пасведчанне, выдадзенае 8 ліпеня 1917 г. В. Л. Дылу ваенным каменданатам Мінска палкоўнікам Кузьмінскім, якое дазваляла наведваць сваякоў у Слуцку

Certificate issued on July 8, 1917 to Jazep Dyla by military commandant of Minsk Colonel Kuzminsky, which allowed to visit J. Dyla's relatives in Slutsk

Лютаўская рэвалюцыя не выклікала радыкальных змен у баўленні мінчанамі вольнага часу, які з'яўляўся натуральным працягам патрэбы чалавека ў адпачынку, маральна-псіхалагічным і фізічным узнаўленні. Нягледзячы на рост коштаў, мінчане знаходзілі сродкі на набыццё квіткоў у культурна-забаўляльныя ўстановы. У гарадскім тэатры па-ранейшаму выступала трупа антрэпрэнёра Бляева, які, апрача класічнай драматургіі, ставіў містычныя драмы М. Метэрлінка, а таксама п'есы рускіх сімвалістаў. На сцэне тэатра выступалі славутыя сталічныя гастралёры, такія як оперны спявак А. М. Давыдаў, драматычныя акцёры П. М. Арленеў і браты Адэльгейм. Вялікім поспехам у публікі карысталіся ўкраінскія драматычныя калектывы, што прывозілі драмы і камедыі – «Запарожац за Дунаем», «Майская ноч», «Наталка-Палтаўка». Прадукцыю лёгкага жанру, кшталту аперэты, вар'етэ, кафэ-шантана, прапаноўвалі летні тэатр «Рэнесанс» у гарадскім садзе, «Камерны тэатр» на Саборнай плошчы, тэатры «Інтымны» на Маскоўскай

[1]Варшав. утро. 1917. 15 июня (№ 408). С. 3.
[2]Варшав. утро. 1917. 11 авг. (№ 430). С. 1.
[3]Варшав. утро. 1917. 11 июля (№ 404). С. 3.
[4]Варшав. утро. 1917. 17 июня (№ 385). С. 3.
[5]Варшав. утро. 1917. 11 сент. (№ 452). С. 4.
[6]Варшав. утро. 1917. 28 июля (№ 418). С. 3.
[7]Гвоздь. Часовая неразбериха // Варшав. утро. 1917. 2 июля (№ 397). С. 3.

вуліцы, «Акварыум» – на Хрышчэнскай, «Парыж» – на Петрапаўлаўскай. Там мелі поспех «песні вуліцы» А. Загорскай, цыганскія рамансы пад гітару Н. Дулькевіч, куплеты Г. Раздольскага, песні А. Вярцінскага ў выкананні Матэа, які выходзіў на сцэну ў касцюме П'еро. На Камароўцы размяшчаўся Амерыканскі клуб, які заўсёды збіраў шмат народу, бо, апрача кінасеансаў, на яго сцэне адбываліся паказы спектакляў, праходзілі эстрадныя выступленні, у ім працавала бібліятэка, буфет-сталовая. Летам 1917 г. тут арганізавалася Першае беларускае таварыства драмы і камедыі[1].

Рэвалюцыя наклала адбітак на вытворчасць расійскіх кінематаграфічных кампаній. Працягваючы распрацоўваць такія жанравыя кірункі, як арыстакратычная трагедыя, містычная драма, авантурная камедыя, яны даволі хутка адгукнуліся на рэвалюцыйныя падзеі шэрагам дакументальных і мастацкіх стужак. Некалькі рэжысёраў і аператараў здымалі гэтыя падзеі на вуліцах гарадоў. Першыя вынікі падобнай працы, зманціраваныя ў стужкі «Свята рэвалюцыі ў Маскве», «Вялікая расійская рэвалюцыя ў Петраградзе», «Прысяга камандуючага Маскоўскай ваеннай акругі на вернасць Расійскай дзяржаве», мінчане змаглі паглядзець у электратэатры «Мадэрн» ужо ў канцы сакавіка 1917 г.[2]

Наступны па папулярнасці пасля хронікі рэвалюцыі сюжэт, які распрацоўваўся ў мастацкім кіно, можна вызначыць як «Царская сям'я і Распуцін». У электратэатры «Гігант» поўныя залы збіралі сенсацыйныя карціны «Ганьба дома Раманавых», «Распуцін знойдзены», «Грышка і Аляксандра», у электратэатры «Эдэн» – «Мікалай і балярына», «Распуцін і яго атачэнне»[3]. Значную цікавасць мінчан таксама выклікалі першыя мастацкія стужкі, знятыя на рэвалюцыйную тэматыку, такія як «Жыццё і смерць лейтэнанта Шміта» альбо «Ахвяра сацыяльнай няроўнасці». Уладальнік электратэатра «Эдэн» рэкламаваў карціну «Вакханалія жарсці» як «знятую паводле рамана А. Мірбо – змагара за роўнасць і волю»[4].

Разам са з'яўленнем фільмаў рэвалюцыйнай тэматыкі ў рэпертуары кінатэатраў горада ў 1917 г. павялічылася колькасць эратычных стужак, што было прамым вынікам адмены цэнзурных абмежаванняў. Назвы падобных фільмаў («Тайны гарэма», «Водар граху», «Аголеная») казалі самі за сябе і не патрабавалі дадатковай рэкламы. Некаторыя з іх прэтэндавалі на рэвалюцыйную пастаноўку пытання аб шлюбе і сям'і.

У адрозненне ад кінематографа, у тэатры прынцыпова новай, рэвалюцыйнай драматургіі ў 1917 г. не з'явілася. Рэпертуар тэатральных труп, якія прапаноўваўся мінскаму гледачу, часткова змяніўся пераважна за кошт кан'юктурных твораў «на злобу дня». Адзін з іх – пастаўленая ў канцы мая ў гарадскім тэатры п'еса «Вясёлыя дні Распуціна» – быў названы крытыкам «ганьбай мінскай сцэны, агіднай карцінкай»[5]. Нечаканым сюрпрызам для мінскай тэатральнай публікі было з'яўленне Таварыства беларускай драмы і камедыі, якое ўпершыню заявіла пра сябе 23 красавіка на сцэне гарадского тэатра спектаклямі «Паўлінка» Янкі Купалы і «У зімовы вечар» Элізы Ажэшка[6].

Рэвалюцыя не спыніла гастрольна-канцэртнае жыццё, якое дазваляла мінчанам дакрануцца да культурных з'яў сусветнага ўзроўню. Так, 25 красавіка на дабрачынным канцэрце, арганізаваным эсэрамі ў падтрымку свайго друку, у будынку дваранскага сходу выступаў знакаміты скрыпач-віртуоз М. Б. Рэйсан[7]. Пасля канцэрта славутага опернага баса М. І. Вавіча арганізатарам давялося вызваляць спевака ад натоўпу прыхільніц шляхам абястэчвання будынку[8]. Тры дні – 2, 4 і 5 верасня – у гарадскім тэатры быў аншлаг з нагоды гастроляў драматычнай трупы пад кіраўніцтвам М. М. Пеціпа[9]. Ужо 6 верасня на той жа сцэне выступаў славуты танцоўшчык і балетмайстар М. Г. Легат[10]. У нядзелю 17 верасня ўсе мінскія аматары фартэпіяннага мастацтва сабраліся ў будынку дваранскага сходу на канцэрце сваёй зямлячкі, прафесара Петраградскай кансерваторыі І. А. Венгеравай[11]. Добрыя водгукі ў прэсе атрымалі канцэрты аматарскага сімфанічнага аркестра аўстрыйскіх ваеннапалонных пад кіраўніцтвам В. А. Складала[12]. Нягледзячы на цяжкасці рэвалюцыйнага часу, мінчане праводзілі канцэрты і вечарыны ўласнымі сіламі, у тым ліку арганізоўваліся выступленні членаў літаратурна-музычнага таварыства «Марсельскія матросы»[13].

Адным з найбольш распаўсюджаных дэмакратычных відаў забавы гараджан па-ранейшаму за-

[1]*Рамановіч Я.* Беларуская хатка // Горад і годы. Мінск, 1967. С. 61–73.
[2]Минский голос. 1917. 28 марта (№ 2389). С. 1.
[3]Минский голос. 1917. 28 марта (№ 2389). С. 1.
[4]Минский голос. 1917. 13 марта (№ 2376). С. 1.
[5]Минский голос. 1917. 31 мая (№ 2440). С. 1.
[6]*П. К.* Беларускі тэатр // Вольная Беларусь. 1917. 26 ліп. (№ 9). С. 3–4.
[7]Минский голос. 1917. 26 апр. (№ 2412). С. 4.
[8]Минский голос. 1917. 2 июня. (№ 2442). С. 3.
[9]Варшав. утро. 6 сент. (№ 448). С. 1.
[10]Варшав. утро. 1917. 6 сент. (№ 448). С. 1.
[11]Варшав. утро. 1917. 17 сент. (№ 456). С. 1.
[12]Варшав. утро. 1917. 28 марта (№ 2389). С. 1.
[13]Варшав. утро. 1917. 14 апр. (№ 2403). С. 3.

ставалася наведванне садоў, сквераў, іншых грамадскіх месцаў на вольным паветры. У 1917 г. шпацыры ў іх часта спалучаліся з грамадска-палітычнымі акцыямі. Так, 18 красавіка гарадскія ўлады наладзілі грашовы збор у фонд палітычных ахвяр старога рэжыму – «Збор Свабоды». Акцыя суправаджалася народнымі гуляннямі, аўкцыёнам, кабарэ, латарэяй, распродажам[1]. Пазней, 22 мая, 9, 24 і 25 чэрвеня, мінчане ахвяравалі грошы на культурна-асветніц-кія патрэбы беларускага народа падчас «беларускіх дзён» на вуліцах горада. Ахвотныя запрашаліся на лекцыі па гісторыі Беларусі, а таксама на выставу нацыянальнага мастацтва[2]. Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў 8 жніўня арганізаваў маштабную акцыю «Мінск – салдату ў акопы», найбольш цікавыя складнікі якой – канцэрт, танцы, баль-маскарад – адбыліся ў Губернатарскім садзе[3].

У чэрвені ўзнавіла сваю працу мінскае аддзяленне міжнароднага спартыўнага таварыства «Санітас». Неўзабаве пад кіраўніцтвам П. А. Шышкова яно правяло гарадскія спаборніцтва па барацьбе, а таксама лёгкай і цяжкай атлетыцы[4]. Урачыстае святкаванне 10-годдзя гімнастычнага таварыства «Сокал» адбылося ў горадзе 3 верасня. Сярод іншых у ім бралі ўдзел члены мясцовага гімнастычнага клуба «Макабі»[5]. Летам 1917 г. аматары фізічных практыкаванняў маглі ўзяць на пракат веласіпеды на трэку ў Губернатарскім садзе. На ўзбярэжжы Свіслачы працавалі купальні з асобнымі нумарамі і «чоўнамі для купання»[6].

Спякотнае надвор'е, якое ўсталявалася ў пачатку лета 1917 г., было прычынай шматлікіх пажараў у «драўляных» раёнах горада. З імі змагалася паслабелае ў выніку мабілізацый Мінскае вольна-пажарнае таварыства. Мінскім пажарнікам – ахвотнікам, лазальшчыкам, рубнікам – дапамагалі эвакуіраваныя ў 1915 г. ковенскія калегі. Пажары лета 1917 г. сталі адным з яскравых успамінаў дзяцінства беларускай актрысы мінчанкі С. М. Станюты: «Летам, калі гарэла, дарослыя бурылі і разнімалі заборы, павеці, каб агонь не перакінуўся далей, на суседскія дамы. Мне, дзяўчынцы, усё гэта здавалася і страшным, і надзвычай цікавым. Цёплымі начамі спаць кlaліся на двары – у дамах баяліся падвалаў, дзяжурылі. Гарэлі крамы, і мы, дзеці, аднойчы елі амаль што смажаныя селядцы з абгарэлых бочак, а ў другі раз – печаныя яблыкі з пачарнелых яблынь»[7].

Распад старых сацыяльных сувязей і нестабільная эканамічная сітуацыя стварылі спрыяльнае асяроддзе для міфатворчасці ў выглядзе чутак. Так, у чэрвені мінчане абмяркоўвалі «навіну» пра тое, што ў горад на сталае жыхарства прыедзе Ленін[8]. Неўзабаве ў Мінску пайшла пагалоска пра тое, што нямецкія аэрапланы раскідваюць над горадам і наваколлем бутэлечкі з невядомай вадкасцю[9]. Новую хвалю чутак справакавалі «нейкія цёмныя пракламацыі», якія заклікалі салдат кідаць зброю, а сялян – захопліваць панскую зямлю[10].

Прыкметай новага часу стала павелічэнне колькасці ананімных лістоў у органы цывільнай і ваеннай улады, а таксама ў рэдакцыі газет. «Грамадскія актывісты» пісалі шматлікія даносы, у якіх выкрывалі тайных прыхільнікаў старога рэжыму, служачых палітычнай паліцыі, дэзерціраў. У красавіку мінскі вайсковы начальнік звярнуўся праз газету да гараджан з просьбай не дасылаць «у значнай колькасці» ананімныя даносы на асоб, якія ўхіляюцца ад выканання вайсковай павіннасці, бо звароты без подпісаў не разглядаліся[11].

На працягу 1917 г. крымінальнае становішча ў горадзе пагаршалася. Да восені самагонаварэнне, хуліганства, бойкі, крадзяжы, рабаўніцтвы, забойствы дасягнулі катастрафічных памераў. З рубрыкі «Здарэнні» тагачасных мінскіх газет можна даведацца пра тое, што рабаўнікі кожную ноч рабілі ўзброеныя напады на кватэры заможных мінчан, хуліганы спусташалі агароды на хутары Людамонт, павялічылася колькасць здарэнняў з удзелам аўта- і мотатэхнікі, уладальнікі кінематографаў спрабавалі прадаваць білеты без акцызных марак. У Мінску пачалі знікаць дзеці, што раней у спакойным губернскім горадзе было выключнай падзеяй. Адным з найбольш небяспечных стаў раён Камароўкі з прылеглым лесам. Аблюбаваны мінчанамі як месца правядзення загарадных пікнікоў, гэта тэрыторыя ператварылася ў крымінальную ўскраіну, дзе стаяў цыганскі табар, а таксама хаваліся ад закону злачынцы і дэзерціры. Актрыса С. М. Станюта ўзгадвала: «Бацька расказваў пра нейкі мітынг каля вакзала: выступала жанчына з прозвішчам Шабат. Раптам стрэл – і яна ўпала, як усё роўна падбітая птушка, раскінуўшы рукі. Бацьк-

[1]Минский голос. 1917. 14 апр. (№ 2403). С. 1.
[2]Варшав. утро. 1917. 27 июня (№ 394). С. 3.
[3]Варшав. утро. 1917. 3 авг. (№ 423). С. 3.
[4]Варшав. утро. 1917. 18 июня (№ 386). С. 3.
[5]Минский голос. 1917. 10 мая (№ 2424). С. 3.
[6]Варшав. утро. 1917. 3 июня (№ 349). С. 4.
[7]*Станюта А. А.* Стэфанія. Мінск, 1994. С. 11.
[8]Варшав. утро. 1917. 8 июня (№ 353). С. 3.
[9]Варшав. утро. 1917. 11 июня (№ 355). С. 3.
[10]Гомел. копейка. 1917. 1 июля (№ 1330). С. 3.
[11]Минский голос. 1917. 7 апр. (№ 2397). С. 3.

ка хацеў гэта адразу ж і замаляваць, але мусіў хавацца ад стрэлаў пад вокнамі цырульні, якія са звонам разляталіся на кавалкі ад куль…»[1].

Эфектыўнасць міліцыі, якая існавала ў выглядзе слабападрыхтаваных атрадаў добраахвотнікаў пад кіраўніцтвам М. А. Міхайлава (М. В. Фрунзэ), была абмежаванай. У гэтых умовах гараджане спрабавалі аб'яднаць высілкі па барацьбе са злачыннасцю і гвалтам, ствараючы дамавыя камітэты самаахòвы. У сярэдзіне мая жыхары вуліц Нова-Маскоўскай, Яўрэйскай, Трубнай, Мацвееўскай, Нова-Раманаўскай, якія ўваходзілі ў 5-ю частку горада, аб'ядналіся ў таварыства самаахòвы ад злачынных элементаў[2].

Часта героямі газетнай крымінальнай хронікі разам з цывільным насельніцтвам рабіліся ваеннаслужачыя. У чэрвені 1917 г. жыхары Мінска былі напалоханы з'яўленнем банды «скакуноў», якія рабавалі па начах людзей на вуліцах з дапамогай тэхнічнага прыстасавання – спецыяльных спружын, прымацаваных да ботаў. Акрамя хуткасці, з якой здзяйснялася злачынства, у іх арсенале была таксама псіхалагічная зброя – белыя балахоны з капялюшамі. Апранутыя такім чынам, «скакуны» наводзілі жах на прахожых на Захар'еўскай і некаторых іншых вуліцах горада. Выкрыццё банды, якая складалася пераважна з маладых салдат-дэзерціраў, патрабавала правядзення сумеснай з Мінскім Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў начной аперацыі з выкарыстаннем пераапранутага ў жанчыну салдата[3].

Ператварэнне ў 1915 г. Мінска ў прыфрантавы горад прывяло да рэзкага павелічэння ў горадзе колькасці адарваных ад нармальнага сямейнага жыцця мужчын – ваенных, а таксама служачых тылавых арганізацый. Падобная сітуацыя стварала павышаны попыт на платныя сексуальныя паслугі, спрыяла прытоку ў горад прастытутак, якія ў 1917 г. падзяляліся на арганізаваных і неарганізаваных. Першыя мелі жоўты квіток, праходзілі медагляд і прапаноўвалі паслугі легальна, у бардэлях, большасць якіх знаходзіліся ў раёне Нова-Чырвонай вуліцы. Другія працавалі нелегальна, з рызыкай для здароўя і нават жыцця, на вуліцах, вакзалах, у рэстаранах і іншых публічных месцах. Найвялікшая канцэнтрацыя неарганізаваных прастытутак была ў гарадскім скверы, дзе абураныя мінчане патрабавалі паставіць пост міліцыі[4].

Роскві платнага кахання непазбежна прыводзіў да пашырэння венерычных захворванняў. Штодня ў міліцыю паступала інфармацыя пра хворых прастытутак, якія падлягалі ізаляцыі і адпраўцы на прымусовае лячэнне. Але ў сувязі з недахопам спецыялістаў, а таксама месцаў у шпіталях нярэдка затрыманыя міліцыянерамі жанчыны вярталіся на вуліцу ўжо на наступны дзень. Карэспандэнт газеты «Минский голос» лаканічна паведамляў у канцы мая: «Прыёмныя мясцовых урачоў-венеролагаў перапоўнены з ранку да вечара»[5].

Да восені 1917 г. у мінчан назапасілася стомленасць ад штодзённых грамадска-эканамічных праблем. Гэта псіхалагічная стомленасць у значнай ступені абумовіла тое, якім чынам у горадзе была ўсталявана савецкая ўлада. Удзельнік тых падзей, камуністычны дзеяч В. І. Солскі, узгадваў: «26 кастрычніка, раніцаю, па ўсім горадзе былі расклееныя чырвоныя плакаты. Гэта быў "Загад № 1 насельніцтву Мінска і наваколля". Ён быў падпісаны мінскім Саветам. Перад плакатамі збіраліся невялікія купкі людзей, чыталі іх даволі апатычна, ішлі далей… Здавалася, што горад быў паралізаваны. Не было ніякіх праяў энтузіязму ці, прынамсі, радасці. Нават салдаты, якія падтрымлівалі новую ўладу, былі змрочныя, неахвотна размаўлялі з прахожымі. У Савеце настрой быў нервовы, але таксама не ўзняты, не радасны. У кастрычніцкія дні ні ў Мінску, ні на фронце не было ніякіх дэманстрацый, ніякіх мітынгаў ні за, ні супраць таго, што адбылося ў Петраградзе»[6].

## Заключэнне

Такім чынам, паўсядзённае жыццё насельніцтва Мінска ў 1917 г. адлюстравала складаную рэчаіснасць пераходнага стану грамадства, транзіт ад імперскай да новай, рэспубліканскай сацыяльнай рэальнасці. Старая дзяржаўная канструкцыя была разбурана, новая знаходзілася на стадыі станаўлення. Рэвалюцыйны энтузіязм, што ахапіў мінчан вясной 1917 г., паступова знікаў пад уздзеяннем матэрыяльных умоў жыцця, якія ўвесь час пагаршаліся. Жыллёвы крызіс, інфляцыя, беспрацоўе, злачыннасць, эпідэмічныя захворванні і іншыя сацыяльна-эканамічныя праблемы ва ўмовах слабай дзяржаўнай улады прымушалі мінчан распрацоўваць індывідуальныя стратэгіі выжывання. Пералом эпох, што адбыўся ў 1917 г., найбольш балюча ўдарыў «маленькага» чалавека, які ў Вялікай рускай рэвалюцыі ўбачыў страту старога стабільнага жыцця, неспрыяльнае для яго развіццё рэвалюцыйных падзей, што да восені набылі характар гуманітарнай катастрофы, і няпэўныя перспектывы.

[1]*Станюта А. А.* Стэфанія. Мінск, 1994. С. 11.
[2]Минский голос. 1917. 24 мая (№ 2434). С. 3.
[3]*Солский В.* 1917 год в Западной области и на Западном фронте. Минск, 2004. С. 92.
[4]Варшав. утро. 1917. 23 авг. (№ 436). С. 3.
[5]Минский голос. 1917. 27 мая (№ 2437). С. 3.
[6]*Солский В.* 1917 год в Западной области и на Западном фронте. Минск, 2004. С. 160.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Мазец В.* Паўсядзённае жыццё поліса ва ўмовах ваеннага становішча: Мінск у 1914–1917 гг. // Знакамітыя мінчане. Мінск і Міншчына ў гады Першай сусветнай вайны: людзі і вайна : матэрыялы VIII беларус.-пол. навук.-тэар. канф. (Мінск, 9–10 крас. 2014 г.) / рэдкал.: А. Вялікі [і інш.]. Мінск, 2015. С. 5–21.

2. *Рудович С. С.* Повседневность революционного Минска 1917 г. в зеркале публицистики Дорофея Бохана // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць (да 945-годдзя Мінска) : зб. навук. арт. / уклад. А. І. Груша. Мінск, 2012. С. 383–397.

3. *Шибеко З. В., Шибеко С. Ф.* Минск. Страницы жизни дореволюционного города. Минск, 1990.

## References

1. Mazets V. [Polis everyday life in the circumstances of war: Minsk in 1914–1917]. *Znakamityja minchane. Minsk i Minshchyna w gady Pershaj susvetnaj vajny*: *ljudzi i vajna* : materials of VIII Belarus.-Pol. sci.-theoret. conf. (Minsk, 9–10 April, 2014). Minsk, 2015. P. 5–21 (in Belarus.).

2. Rudovich S. S. [Everyday life of revolutionary Minsk in 1917 as it reflected in the newspaper articles of Dorofej Bohan]. *Minsk i minchane: dzesjac' stagoddzjaw gistoryi. Krynicy pa gistoryi gorada. Sacyjalnyja struktury i pawsjadzjonnasc' (da 945-goddzja Minska)* : collect. of sci. articles. Minsk, 2012. P. 383–397 (in Russ.).

3. Shibeko Z. V., Shibeko S. F. [Minsk. Pages of pre-revolutionary city life]. Minsk, 1990 (in Russ.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 21.04.2017.*
*Received by editorial board 21.04.2017.*